74

РАЗЬБА ПА ДРЭВУ

рэкамендацыі юным рэзчыкам, кіраўнікам кружкоў

РУДЭНКОЎ Мікалай Мікалаевіч

РАЗЬБА ПА ДРЭВУ

Рэкамендацыі юным рэзчыкам, кіраўнікам гурткоў.

57483

"Фінансы, улік, аудыт",
Мн. 1995

ББК 63.3(2б)

Рудэнкоў Мікалай Мікалаевіч
Разьба па дрэву.
Рэкамендацыі юным рэзчыкам,
кіраўнікам гурткоў.

У брашуры абагульняецца вопыт работы настаўніка тэхнічнай працы Мінскай сярэдняй школы N 67. Даюцца рэкамендацыі аб падборы матэрыялаў, рэжучых інструментаў, рабочых куткоў і г.д. Разлічана не толькі на школьнікаў, але і на дарослых аматараў разьбы па дрэву.

© М.М. Рудэнкоў



УВОДЗІНЫ

Разьба па дрэву з'яуляецца адным з найцікавейшых відаў народнага дэкаратыунага мастацтва. У ім адлюстроўваецца мастацкая адоранасць нашага народа, яго любоў да ўпрыгожвання жылля і бытавых прадметаў, высокае тэхнічнае майстэрства, уменне разумець і выкарыстоўваць мастацкія магчымасці матэрыялу.

Для плённай творчай работы ў галіне разьбы па дрэву недастаткова авалодаць тэхнічнымі прыёмамі яе выканання. Важна выхоўваць у сабе мастацкі густ, разумець, што ты робіш, і для чаго, ведаць магчымасці кожнага матэрыялу, адчуваць яго.

Пачынаючым рэзчыкам неабходна ўважліва вывучаць лепшыя ўзоры разьбы, вялікі вопыт, накоплены многімі пакаленнямі майстроў-рэзчыкаў. Гэта дапаможа ім не толькі авалодаць рамяслом, але і дарасці ў сваёй творчасці да вялікага мастацтва. Талент і арыгінальнасць вучняў праяўляюцца хутчэй за ўсё ў агульных якасцях асобы: ініцыятыўнасці, назіральнасці, любві да заняткаў, самастойнасці выказванняў, здольнасць ставіць адпаведныя мэты.

З узростам у дзяцей, якія сур'ёзна займаюцца разьбой, можна бачыць і сапраўдныя мастацкія дасягненні, і, самае галоўнае, іх жаданне навучыцца гэтаму вялікаму рамяслу.

І менавіта ў гэты час, як правіла, пачынае складвацца мастацкі ідэал, які выразна адчуваецца ў творчасці школьніка. Мастацтва са знешняга выхавацеля перарастае ў актыўную духоўную патрэбнасць школьніка, уплывае на яго эстэтычныя погляды.

У нашай краіне, якая даўно славіццаляснымі багаццямі, мастацтва разьбы па дрэву атрымала развіццё яшчэ ў глыбокай старажытнасці.

Дрэва заўсёды было пад рукой і з'яўляецца адным з матэрыялаў, якія прадаставіла прырода чалавеку і які паддаецца апрацоўцы нескладаным інструментам. З дрэва будавалі жыллё і стваралі неабходныя прадметы попыту.

Цудоўнымі мастацкімі творамі станавіліся ў руках народных умельцаў драўляныя прадметы дамашняга ўжытку: сталы, сундукі, ларцы, люлькі, пралкі, каўшы і іншыя рэчы. Яркасцю вобразаў, дакладнай назіральнасцю, тонкім гумарам і сапраўдным пачуццём прыгажосці адрозніваюцца народныя драўляныя цацкі. Разьба становіцца больш высокай па рэльефу, павялічваецца ўжыванне ажурных прарэзей, якія ствараюць вялікую ігру света-ценяў, павялічваецца дынаміка арнаменту; яна часта злучаецца з роспісам, пазалотай.

У нашай краіне разьба з'яўляецца любімым відам народнага дэкаратыўнага мастацтва. Вывучаць гэтае мнагаграннае і багатае па сваіх магчымасцях мастацтва, развіваць яго ў школьнікаў - ганаровы абавязак маладых майстроў-рэзчыкаў па дрэву.

1. АБСТАЛЯВАННЕ ПАМЯШКАННЯ

У рабоце пачынаючых рэзчыкаў узнікае многа пытанняў: дзе знайсці неабходны інструмент? Якую і дзе ўзяць загатоўку? Як яе замацаваць у час работы? З чаго пачаць? І г.д.

На ўсе гэтыя пытанні чытач атрымае поўны адказ у дадзенай брашуры. Ва ўмовах жа школьных майстэрань проста. Там ёсць 20 верстакоў і наборы сталярнага інструмента. А той інструмент, якога не хапае для разьбы, мы, напрыклад, робім самі. Для правядзення гуртковай работы па мастацкай апрацоўцы драўніны ў нашай сярэдняй школе ёсць верстакі і светлае вялікае памяшканне. Сталярная майстэрня аформлена рознымі работамі нашых вучняў. Праз некаторы час мы мяняем экспазіцыі работ з мэтай паказаць майстэрства сваіх выхаванцаў.

Фота 1. Дэкаратыўнае пано. Матэрыял - ель. 1985г. Работа вучняў.



Дома можна працаваць на кухні, пераабсталяваўшы кухонны стол. Ён зручны тым, што ў месцы паміж дзвюмя крышкамі складзены інструмент рэзчыка. Знаходзіцца ён пад рукой. Для работы рэзчыкаў прыгоднае любое сухое, светлае памяшканне з нармальнай тэмпературай. Для разьбы падыйдзе таксама і лоджыя зашклёная. Бо спецыяльных памяшканняў у нашых кватэрах няма. Тэмпература ў майстэрні павінна быць 18-20° С.

Рабочае месца рэзчыка павінна асвятляцца злева і справа. Шырыня крышкі верстака павінна раўняцца 50—70 см, а даўжыня на аднаго рэзчыка 100—130 см. Вярстак патрэбна рабіць з дошак таўшчынёй 60—70 см. Ёмкі вярстак менш шатаецца і не дрыжыць у час работы. Для замацавання дэталей на ім служаць розныя трымацелі. Яны павінны быць простыя ў выкананні і добра замацоўваць дэталі па даўжыні і шырыні, а так сама ў любым месцы крышкі верстака.

Стол для рэзчыка павінны быць асобны. Інструментальная шафа павінна мець асобныя шуфляды для інструмента рэзчыка.

2. РЭЖУЧЫ ІНСТРУМЕНТ РЭЗЧЫКА І ЯГО ВІДЫ

Асноўны інструмент рэзчыка - гэта рэжучы: стамескі, нажы, касякі, клюкарзы, стамескі-царазікі, долатцы, стамескі паўкруглыя, разакі звычайныя.

Фота 2. Інструменты.

Акрамя таго, рэзчык таксама павінен мець і інструмент для свідравання -



калаварот, дрэль ручную, электрычную, свёрлы розныя; для выпільвання - штыкнажоўку, лучковую пілу, электралобзік, і іншы: шархебель, рубанак, паўфуганак, вугольнік, лінейку, цыркуль, карандаш, кіянку, малаток металічны, струг.

Размеры асобных частак стамесак непастаянныя: чым стамескі вузейшыя, тым памеры асобных частак іх меншыя і наадварот.

Палатно робіцца даўжынёй 80—100 мм. Шыйка - 20—30 мм, яна можа быць у папярэчным сячэнні і круглай, і прамавугольнай формы. Хваставік павінен быць у сячэнні абавязкова квадратнай формы. Таўшчыня яго 4—6 мм і даўжыня 50—60 мм. Форма яго па даўжыні павінна быць клінавідная. Больш доўгімі стамескамі працаваць нязручна, а кароткія хутка зношваюцца.

Разакі шырокія неабходны для выканання геаметрычнай і любой другой разьбы, а вузкія - для выканання дробнай разьбы, не геметрычнай.

У палатна разака ёсць пярэдняя кромка, пласці - левая і правая, задняя кромка і затылак; канечная частка палатна, як і ва ўсіх відах стамесак, называецца рэжучай. Стамескі прамыя ў асноўным выкарыстоўваюцца для чарнавой апрацоўкі. Шырыня палатна прамых стамесак робіцца ўсюды аднолькавая. Таўшчыня стамесак розная ў залежнасці ад іх шырыні. Пярэдняя пласць у прамых стамесак павінна мець правільную плоскую форму і не мець ні царапін, ні ўвагнутасцей.

Паўкруглыя стамескі дзеляцца на сярэднія і круглыя або адлогія. Яны з'яўляюцца асноўным інструментам у выканані ўсіх відаў разьбы, за выключэннем геаметрычнай. Форма паўкруглай стамескі вызначаецца радыусам загіба палатна

і шырынёй палатна па прамой лініі. У адлогіх стамесак радыус загіба палатна прыкладна ўдвая большы, чым шырыня, у сярэдніх стамесак радыус роўны шырыне палатна, а ў круглых радыус прыкладна ўдвая больш яго шырыні.

Царазікі - падобныя на паўкруглыя стамескі. Служаць яны для прарэзкі жылак і бываюць, як правіла, толькі вузкія.

Вугалкі служаць для прарэзкі ліній жылак. Шырыня палатна не мае вялікага значэння і кожны бок можа быць ад 5 да 25 мм.

Нажы патрэбны для выканання праразной і накладной разьбы і профільных работ.

Клюкарзы - гэта любыя стамескі з загнутай каля палатна шыйкай. Яны служаць для выканання глыбокай барэльефнай разьбы, для зачысткі фона ў глыбокай рэльефнай і барэльефнай разьбе.

Як правіла, у школах плоскіх стамесак рознай шырыні маецца шмат, а круглых і царазікаў калі і ёсць, то мала. Але ў школах ёсць муфельныя печы, і настаўнік тэхнічнай працы разам з гуртоўцамі, маючы сталь 65 (сырую), робяць разцы самі. У камплектах рэжучага інструменту ў рэзчыка можа быць розная колькасць стамесак.

Калі рэзчык выконвае толькі адну геаметрычную разьбу на р о з н ы х пародах драўніны, то ў яго можа быць адзін разак, прамая стамеска і кіянка.

А для выканання рознай разьбы на мэблі, дробных рэчах, дамавой разьбы лепш набыць інструмент для рэзчыка падольскай вытворчасці і дабавіць да яго нажы, разакі, штык-нажоўку.

Калі разьба дробная, то спатрэбяцца дробныя стамескі розных відаў. Аматары-рэзчыкі робяць па магчымасці інструмент самі, і ў іх набіраецца некалькі дзесяткаў, а то і соцень розных стамесак.

Для геаметрычнай разьбы ператочваем нажы для бобаў і старыя палотны ад механічнай нажоўкі.

Пры выкананні апрацоўкі пано выкарыстоўваюць стамескі, і ў ходзе работы ручкі часта выходзяць са строю. Таму ручкі для стамесак лепш рабіць з камлёвай часткі бярозы. Яна сухая і вельмі моцная. У загатоўцы свідруюць адтуліну дыяметрам 10 мм і на глыбіню 70—80 мм,адтуліну запаўняюць эпаксідным клеем і ўстаўляюць хваставік ляза. Пры такой падрыхтоўцы інструмента доўгі час не будзе клопатаў з ручкамі. Ручкі можна тачыць на такарным станку па апрацоўцы дрэва (ТСД) або стругаць.

3. ВЫБАР ІНСТРУМЕНТА РЭЗЧЫКА

Для работы рэзчыку могуць спатрэбіцца стамескі, разцы, нажы і іншыя інструменты, якія не складана зрабіць кавалю-слесару або самому настаўніку тэхнічнай працы ў школьнай майстэрні. Кавалю-слесару для выканання разцоў неабходны эскізы і матэрыялы. Тут жа патрэбна растлумачыць яму тэхнічныя ўмовы, якія прад'яўляюцца да разцоў.

Якасць стамесак залежыць ад сорта сталі. Вытворчасць выпускае разцы са сталі 65 г. і падшыпнікавай 61х15. Вопытныя рэзчыкі аддаюць перавагу разцам са сталі 65 г. Пры рабоце такой разец будзе сам уразацца ў дрэва. А пры падчыстцы стружка амаль прыліпае да разца.

Рабіць разцы можна і з паломаных палоцен механічнай нажоўкі, выбыўшых з карыстання напільнікаў, рэсораў легкавых аўтамабіляў і г.д.

__Форма стамескі.__ Грубая форма стамескі, атрыманая шляхам коўкі, даводзіцца да неабходнай дакладнасці шляхам апрацоўкі стамескі на наждачным крузе, затым шліфуецца на бакелітавым крузе (гумавым) і далей паліруецца на войлачным крузе. Разцы, выкананыя на наждачным крузе, патрэбна старанна апрацоўваць. Пры гэтым трэба вытрымаць правільныя памеры, каб восі хваста і палатна стамескі складалі адну прамую лінію, а палатно стамескі не было перакручана. Асабліва важна, каб пярэдняя пласць і задняя мелі правільную форму. Затым стамескі шліфуюцца і паліруюцца.

Пасля апрацоўкі іх закальваюць,у выніку чаго яны атрымоўваюць неабходную цвёрдасць. Калі закалёная стамеска ў працэсе работы стала выкрышвацца, лязо стала ламацца, значыць вы перакалілі інструмент. Не варта засмучацца. Нагрэйце на адкрытым агні рэжучую частку інструмента прыкладна да пасінення і затым пакіньце астыць на паветры. Такім чынам вы "адпусціце" сталь і падрыхтуеце яе для работы.

Заточка рэжучага інструмента патрабуе вялікай увагі, бо пры заточцы метал награваецца і змяняецца яго структура. Пры заточцы інструмента на наждачным крузе трэба сачыць за тым, каб вугал заточкі не перавышаў 20° і лёгка прыціскаць стамеску да круга, інакш калі на кончыку ляза з'явілася сінява, гэта небяспечна і якасць стамескі пагаршаецца. А разцы, зробленыя з аджыўшых палоцен механічнай нажоўкі, можна заточваць не звяртаючы ўвагі на тое, што разец сінее і бялее, пры астыванні яго якасць не пагаршаецца.

4. ЗАХОЎВАННЕ ІНСТРУМЕНТУ

Пасля заточкі і папраўкі інструмент патрэбна выцерці. Захоўваць яго лепш у спецыяльных укладках (рэйка з гнёздамі) у гарызантальным або вертыкальным стане. Можна заварочваць у палатно, укладваць іх чаранкамі ў розныя бакі. Атрымаецца невялікі скрутак і зручны пры пераносцы. Укладваючы іх на доўгі час, патрэбна працерці прамасленай анучкай з мэтай папярэджання ад ржаўчыны.

5. РАЗМЕТАЧНЫ ІНСТРУМЕНТ

Для выканання разметачных падрыхтоўчых работ у рэзчыка павінен быць разметачны інструмен.

Аловак служыць для нанясення ліній і павінен быць просты, мяккі і не хімічны, бо гэты карандаш пакідае карэлыя плямы.

Гумка патрэбна для зняцця непатрэбных ліній. Лепш простая, белая.

Цыркуль — для вычэрчвання акружнасцей. Лепш чарцёжны.

Лінейка — для абвядзення прамых ліній. Пажадана мець рулетку ў 30—40 см і мятровую драўляную.

Вугольнік — сталярны патрэбен для нанясення перпендыкулярных ліній да кромкі вырабу.

Ярунок патрэбен для нанясення ліній пад вуглом у 45° і 130° да кромкі вырабу.

Транспарцір патрэбен для дзялення вуглоў. Можна выкарыстаць просты вучнёўскі.

Калька — для зняцця малюнка з арыгінала і пераводу яго на выраб.

Шаблоны патрэбны для хутчэйшага нанясення малюнка на выраб. Робяцца яны самім рэзчыкам з тонкай паперы, картона, тонкага ліставога металу.

6. ІНШЫ ІНСТРУМЕНТ

Малаток. Для прабіўкі дзяржавак цвікамі.

Абцугі. Для выцягвання цвікоў. Зараз у магазінах ёсць універсальныя абцугі: малаток, адвёртка і адкрывацель банак.

Чыканы. Патрэбны для чаканкі фону. Робяцца розных відаў.

7. МАТЭРЫЯЛ. ПРЫРОДА ДРАЎНІНЫ І ЯЕ БУДОВА

На уступных занятках па мастацкай апрацоўцы драўніны трэба напомніць вучням, чаму многія пано і вырабы выкананы з розных парод драўніны.

Напрыклад: ручкі і калодкі сталярнага інструмента, крышкі верстакоў, падлогі драўляныя і паркетныя, вокны, дзверы і г.д. робяць з ліпы і вольхі, а гнутую мэблю не робяць з сасны і елкі. Наша задача падвесці вучняў да разумення неабходнасці правільнага выбару і ўжывання парод драўніны пры выкананні розных вырабаў. Падбіраючы драўніну для будучай работы, рэзчыку трэба ведаць яе годнасць і недахопы і ведаць яе будову.

Ствол дрэва складаецца з вертыкальна накіраваных валокан, размешчаных вакол стрыжня кольцамі. Для ўсведамлення рысунка драўніны (тэкстуры) неабходна ведаць яе разрэзы:

1. Тарцовы або папярэчны.

2. Тангентальны.

3. Радыяльны.

На папярэчным разрэзе бачны гадавыя слаі-кольцы і па іх можна вызначыць колькі год зрэзанаму дрэву.

На тангентальным разрэзе мы бачым тэкстуру - уласцівы рысунак дрэва, а на радыяльным - аднародную драўніну, магчымы прамыя лініі ўздоўж разрэза. Драўніна для разьбы павінна мець вільготнасць не больш 12 %, бо больш вільготная будзе рэзацца лепш, але чыстата разьбы будзе намнога горшая. Пры выкананні можа пакаробіцца, патрэскацца і дае адпаведную ўсушку.

Чым мякчейшае дрэва, тым мякчей яго рэзаць, але інструмент павінен быць больш востры, чым пры рабоце з цвёрдай пародай.

Для выканання ручак для рэжучага інструменту лепш падыходзіць драўніна бярозы з камлёвай часткі, бо тут яна свіляватая, дрэнна расчэпліваецца. Свіляватасць замаруджвае апрацоўку драўніны, але затое больш моцная ў рабоце. А каб ручкі былі больш даўгавечнымі, у адтуліну, падрыхтаваную пад стамеску, неабходна заліць эпаксідную смалу і ўставіць стамеску. У такіх выпадках можна нават не надзяваць захоўваючае кальцо ад расчаплення.

<u>Ліпа</u>. Парода без'ядровая, дае драўніну белага колеру, лёгкая, мяккая, добра апрацоўваецца, рэжацца, мала каробіцца. З ліпы атрымоўваюцца добрыя сталярныя і бакарныя работы. Вельмі добра на дравясіне ліпы выконваецца геаметрычная разьба, праразная. Недахопам ліпы з'яўляецца тое, што ў драўніне ліпы непрыгожая тэкстура і колер. Драўніна ліпы малапрыгодная для мэблі, пагэтаму яе выкарыстоўваюць пераважна для выканання ўпрыгожванняў.

<u>Вольха</u>. Без'ядровая парода, дае лёгкую сярэдняй цвёрдасці драўніну аднароднай будовы. Колер яе ў свежавысечаным стане белы, а на паветры драўніна хутка набывае чырванаватабуры колер. Сырая рэжацца лёгка, сухая вельмі цяжка. Яна добра прымае розную апрацоўку (аддзелку). Вольху яшчэ ў народзе называюць " беларускім чырвоным дрэвам ".

<u>Бяроза.</u> Без'ядровая, забалонная парода. Драўніна яе сярэдняй цвёрдасці, белага колеру з чырванаватым або жаўтаватым адценнем. Але драўніна бярозы хутка рэагуе на змяненне тэмпературы, вільготнасці, моцна каробіцца, трэскаецца, усыхаецца. Драўніна бярозы ўжываецца для вырабу мэблі, корпусных дэталей,

фанеры, інструменту, ручак да напільнікаў, разцоў, латкоў і г.д.

Вельмі каштоўныя бярозавыя " капы". У іх своеасаблівая знешняя форма і падкоркавая будова, якая прыдае адпаведную прыгажосць вырабам з капа. Але неабходна ведаць, што капа бярозы не прапускае паветра, пагэтаму свежазрэзаную драўніну нельга доўга трымаць неашкуранай, у іншым выпадку яна задыхнецца і прыйдзе ў нягоднасць.

Карэльская бяроза. Своеасаблівая па будове, па тэкстуры, росту. Расце карэльская бяроза невысокая, хутчэй за ўсё яна нагадвае дрэва яблыні. Тэкстура вельмі прыгожая. Драўніна добра рэжацца. Пры апрацоўцы на ТСД трэба быць вельмі ўважлівым. Расце ў лясах Беларусі.

Дуб. Парода ядровая, кольцапоравая, цвёрдая. Забалань дуба вузкая, белая, з жаўтаватым адценнем. Драўніна дуба ў ангентальным разрэзе мае прыгожую тэкстуру і з'яўляецца каштоўнейшым матэрыялам у мэблевай вытворчасці. Больш каштоўная драўніна моранага дуба. Яна выкарыстоўваецца як аддзелачны матэрыял, дарэчы, вельмі дарагі. Драўніна моранага дуба цвёрдая. Разьба па ей атрымліваецца прыгожая, хоць выконваць яе вельмі цяжка. Добра рэжацца "вольхавідны" дуб, які задыхнуўся або загінуў. Ён больш крохкі і добра апрацоўваецца рэжучым інструментам.

Арэх. Ядровае, рассеяннапоравая цвёрдая парода з вялікімі сасудамі. Цвет і тэкстура арэха вельмі прыгожая. Арэх добра і чыста рэжацца і рэдка адшчэпваецца.

З хвойных парод для разьбы выкарыстоўваюць сасну і елку. Разьба на яловай дошцы больш прыгожая, чым на сасновай. Рэжацца добра, але адшчэпваецца. Рэзчык, які асвоіў тэхніку разьбы, справіцца і з работай на другіх пародах драўніны.

Калі школьнікі займаюцца разьбой і доўга, то яны ўжо адчуваюць яе і гэта дае ім магчымасць падбіраць пароду драўніны для сваёй работы.

8. ВІДЫ ПІЛАМАТЭРЫЯЛАЎ І ІХ ВЫБАР

Для разьбы па дрэву выкарыстоўваюць розныя пароды драўніны. Выбар той або іншай пароды залежыць ад назначэння і формы ўпрыгожваемага вырабу і віду разьбы.

Рэзчыку трэба для работы на толькі дошкі, але і гарбыль, круглы лес. Пры распілоўцы бярвенняў уздоўж валокнаў мы атрымоўваем наступныя віды піламатэрыялаў:

Мал. 1.

1) Гарбыль - дзелавы

2) Гарбыль - драўляны



Мал. 2.
Дошка абразная і неабразная.



Яшчэ мы атрымоўваем плашчак - гэта бервяно, абпіленае з двух бакоў. А распілаваўшы з чатырох бакоў, атрымліваем брускі.

Мал. 3. Брускі і бруссі.



Гарбыль дзелавы адрозніваецца ад драўлянага тым, што дзелавы ідзе для разьбы, яго можна распілоўваць на рэйкі, брускі і дошкі, толькі ўжо на цыркулярнай піле.

Драўляны гарбыль ідзе на дровы або служыць другараднай сыравінай для вытворчасці пліт ДСП і ДВП.

З лёгкіх парод для разьбы найбольш часта ўжываюць ліпу. Драўніна добра рэжацца, мала растрэскваецца і каробіцца. Вельмі добра на ёй выконваецца плоскавыемчатая і плоскарэльефная разьба. З-за нізкай цвёрдасці ліпу не выкарыстоўваюць для вырабу мэблі. Яе ужываюць абмежавана дробнымі бытавымі вырабамі, рознымі цацкамі, пасудай і наяўнасцю ў малой колькасці.

Бяроза лёгка, добра і чыста рэжацца. Для ўнікальных работ добрая драўніна свіляватая з камлёвай часткі бярозавага крыжа. Яе недахопам з'яўляецца тое, што яна лёгка паглынае і аддае ваду, значыць, яна схільная да растрэсквання.

Для вырабу пасуды і сувеніраў выкарыстоўваюць асіну і топаль. Па рэзачна-механічных якасцях яны бліжэйшыя да ліпы але яны часцей шчапаюцца. Пры загатоўцы гэтых парод драўніны неабходна ведаць, што ў растучым дрэве сустракаецца ядровая гніль. З даўніх часоў дуб ужывалі для вялікіх дэкартыўных розных работ і вырабу мэблі з разьбой. Разьба па дубе вельмі складаная і працаёмкая з-за высокай цвёрдасці. Разьба выконваецца на дэталях мэблі, на сабранай мэблі, на дэталях карнізаў дамоў, налічнікаў, слухавых вакон і г.д.

Ажурная разьба, выкананая народнымі майстрамі, мела на мэце не толькі прыгажосць. Кожная з іх мае і практычнае значэнне. Напрыклад, устроеная дошка (прычэліна) прыкрывае канцы абрашоткі, якія тырчаць з-пад страхі, каб у іх тарцы не пранікала вільгаць, якая псуе дрэва. Тое ж назначэнне мае тарцовая дошка, якую прыбіваюць на тарцы драўлянага дома-зруба. Налічнік акна закрывае стык паміж каробкай акна і бярвеннямі зруба. Канцы многіх дэталей дэкарыравалі ажурнай разьбой. Рознымі рабілі і так.званыя палаценцы - ніжнія канцы прычэлін, якія выступаюць з-пад страхі.

Мал. 4;5;6;7;8;9.











У наш час ажурная - дамавая разьба знаходзіць ужытак для ўпрыгожвання сельскіх драўляных дамоў, дачных домікаў, бяседак, навесаў, церамкоў на дзіцячых пляцоўках. Прытым разьба выконваецца на пародах драўніны больш распаўсюджаных, такіх як ліпа, вольха, бяроза, дуб, арэх, сасна, елка і г.д.

Драўніна дэталей, якая прызначана для мэблі, не павінна мець ніякіх недахопаў, паколькі яны толькі псуюць разьбу.

Драўніна для разьбы павінна быць сухая. Вызначыць вільготнасць драўніны, не маючы электравільгацемера, можна па дотыку рукой і па вазе. Чым мякчэйшая драўніна, тым рэзаць па ёй лягчэй, але каб атрымаць чыстую разьбу, патрэбен вельмі востры інструмент.

Вялікае значэнне ў разьбе мае зрэз дошкі радыяльны або тангетальны. На тангетальным зрэзе рэзаць фізічна цяжэй, але разьба атрымоўваецца больш прыгожай. А на радыяльным разьба менш прыгожая, але рэжыцца лягчэй. Рэзаць шліфаваныя паверхі лепш пазбягаць, бо абразіўныя часціцы набіваюцца ў поры драўніны і вельмі хутка затупляецца рэжучы інструмент.

9. СУШКА І АПРАЦОЎКА

Вільготная драўніна пры высыханні трэскаецца, гнецца, усыхаецца, паражаецца грыбкамі. Трэшчыны бываюць іншы раз такія глыбокія, што драўніна прыходзіць у непрыгоднасць. Таму яе неабходна сушыць, каб вільготнасць была не больш за 12 %. Сушыць драўніну можна ў сушыльных камерах і пад адкрытым небам пад навесам.

Першы від сушкі лепшы тым, што драўніна нам патрэбна сухая, незалежна ад надвор'я.

Калі аб'ёмы работ невялікія, то драўніну, роўна складзеную, можна сушыць і ў памяшканні, якое ацяняецца, недалёка ад батарэй. Але пры гэтым неабходна ведаць, што ліставыя пароды драўніны, елку, лістоўніцу пры высыханні часта круціць.

Гатовыя вырабы неабходна захоўваць у сухім памяшканні. Шырокія дошкі трэба дадаткова скруціць дротам, каб яны пасля сушкі крыху адляжаліся і толькі потым пускаць іх у справу. Калі дошкі неабразныя, то іх трэба ачысціць ад кары. І яшчэ трэба ўлічваць, што драўніна ўсыхаецца па шырыне больш, чым па даўжыні.

Апрацоўку піламатэрыялаў лепш выконваць на стругальным станку. А калі яго няма, можна шархебелем, затым рубанкам. Вопыт работы паказаў, што лязо рубанка лепш заточваць пад двайным вуглом. Спачатку мы вастрым лязо пад вуглом 10—15°, потым, прыкладна з сярэдзіны завостранай паверхні, мяняем вугал на 2-3°.

Мал. 10. Заточка ляза гэбліка.



Гэты від ці прыём заточвання ляза дае нам больш якасную адгабляваную паверхню без прымянення стружкаламацеля. Такі прыём заточвання ляза рубанка, шархебеля і паўфуганка выпрабаваны і даў добрыя вынікі.

Калі мы хочам рабіць пано, дзе неабходна склейваць некалькі дошак для павелічэння шырыні, то пласты загатовак габляваць не трэба. Пасля дошкі, збітыя ў шчыт, пад вуглом 60 габлюем шархебелем, пакуль не будзе роўная паверхня, а затым рубанкам, пры неабходнасці можна і паўфуганкам.

Новы інструмент, як правіла, вострым на наждаку. Для гэтага лепш выкарыстоўваць дробназерністы камень. Пры завострыванні разцоў трэба сачыць за тым, каб была роўная фаска. Паколькі ў кружку займаюцца дзеці розных узростаў, то вострыць інструмент на наждаку настаўнік, а вучні даводзяць нажы самі.

Мал. 11. Прымыканне фаскі да бруса.

1. Правільна.

2 і 3. Няправільна.



Важна ведаць, каб вугал заточвання інструмента знаходдзіўся поўнасцю на бруску.

Прымыканне фаскі к бруску трэба не толькі бачыць, колькі адчўваць пальцамі левай рукі. Вострыць неабходна да таго часу, пакуль завусеніца не стане зусім тонкай, потым пераварочваем стамеску (долата) і цесна прыціскаем к бруску, робячы два рухі. Правяць на асялку ці на войлачным кругу з пастай ГОИ.

Дзеці, вядома, не хочуць сачыць за сваім інструментам, каб ён быў вострым. У такім выпадку пачынаючаму рэзчыку трэба даць стамеску не вельмі вострую. Прыкладна праз гадзіну неабходна паглядзець на яго работу, звярнушы увагу на вастрыню інструмента, потым навастрыць стамеску і даць вучню ужо востра наладжаны інструмент. Праз некаторы час праверыць яго работу і падвесці вынік. Вось тады дзеці лепш глядзяць за інструментам.

51483

10. ГЕАМЕТРЫЧНАЯ РАЗЬБА

Геаметрычная разьба выконваецца галоўным чынам адным разаком, і таму арнамент геаметрычнай разьбы складаецца з элементаў строга геаметрычнай формы: паглыбленых, трохгранных і чатырохгранных паглыбленняў, ногцявідных нарэзак і г.д.

Тэхніка геаметрычнай разьбы дазваляе таксама і розныя работы раслінных форм.

Выкананне геаметрычнай разьбы простае. З інструментаў, акрамя разака, неабходна яшчэ два долаты. Прыёмы геаметрычнай разьбы дазваляюць выконваць разнастайныя прыгожыя арнаменты. Ва ўсіх відах геаметрычнай разьбы і асабліва ў трохграннай выразанай, у розных трохвугольніках, а таксама ў ногцявіднай атрымоўваецца добрая гульня светаценю.

Прыёмы работы разаком найбольш простыя і зразумелыя. Таму спачатку вывучаюцца больш простыя прыёмы, а затым больш цяжкія.

Пачынаючым рэзчыкам я прапаную рэзаць спачатку проста лініі ўпоперак і ўздоўж валокан, затым квадрацікі і гэтак далей, усё ўскладняючы.

Разьба квадрацікаў выконваецца ў наступным парадку. Надразаюцца падрад усе лініі ўпоперак валокан, а апошняя лінія падразаецца далей на шырыню будучай лініі. Затым падразаюць усе лініі ўздоўж валокан. Пры прарэзванні ліній саломка, якую разрэзалі раней уппоперак валокан на дробныя часткі, павінна вылецець.

Пры рэзанні ўздоўж валокан з бакавым ухілам каля 30—40° правай рукой націскаюць на разак, а пальцам левай рукі яго спыняюць, затармажваюць.

Пры выкананні разьбы неабходна правільна рабіць рухі дзюбкай разца.

Калі рэзчык правільна выконвае ўсе аперацыі пры прарэзванні ліній, то саломка павінна вылятаць сама, калі рэзчык дзьмухне. Прарэзваць лінію трэба роўна на глыбіню або крыху глыбей.

Не трэба пры разьбе аддзіраць саломку пальцамі ці сколваць разцом. Лініі ўпоперак валокан рэжуцца так, як і ўздоўж валокан. Спачатку праразаюць кончыкі будучай саломкі, а затым доўгія лініі. Калі рабіць наадварот, то канцы ліній будуць нячыстыя. Калі разак ідзе цяжка, то пятку разака неабходна злёгку прыпадняць.

Разьба вялікіх гарошын у разетцы выконваецца наступным чынам. Надрэзка злева направа. Надрэзаць гарошыну гэтым прыёмам неабходна бесперапынным рухам стамескі кругом гарошыны.

11. КОНТУРНАЯ РАЗЬБА

Тэхніка контурнай разьбы заключаецца ў разьбе ліній рознай шырыні і глыбіні - прамых, крывых па акружнасці і адвольнай крывізны.

Мал. 12. Лініі і фон у контурнай разьбе.



Прыёмы гэтай разьбы з'яўляюцца развіццём прыёмаў разьбы разаком і паўкруглай стамескай ліній, нагаткоў і лісточкаў у геаметрычнай разьбе, а арнаменты могуць быць і чыста геаметрычнага і расліннага характару.

Такім чынам, тэхніка і арнамент контурнай разьбы з'яўляюцца развіццём тэхнікі і арнаменту разьбы геаметрычнай.

Арнамент, які выкананы тэхнікай контурнай разьбы, мае выгляд нейкай незакончанасці, лініі яго розныя, жорсткія, гульні светаценю ў контурнай разьбе вельмі мала. Таму контурнай разьбой упрыгожваюцца, галоўным чынам, прадметы, якія павінны знаходзіцца ў малаасветленых месцах.

Дошчачкі трэба замацоўваць нерухома. Працаваць неабходна дзвюма рукамі. Гэта дазваляе дзейнічать больш упэўнена і хутка.

Фото 3, 4. Сонейка. Матэрыял - сасна. Работа вучняў.



12. РАЗЬБА ЛІНІЙ ПАЎКРУГЛЫМІ СТАМЕСКАМІ

Надрэзванне гарошын робяць кругам справа налева і наадварот. Калі матэрыял цвёрды, то неабходна надрэзванне паўтарыць.

Надрэз мелкіх гарошын выконваецца вярчэннем паўкруглай стамескі адным разцом кругом гарошыны.

Добрая работа рэзчыка заключаецца не толькі ў высокай тэхніцы авалодвання інструментам, але і ў мастацкім разуменні арнаменту і яго асобных форм.

12.1. Заавальная разьба

Калі праразныя лініі контурнай разьбы закругліць ці, як гавораць, заавaліць, то мы атрымаем заваленую разьбу. Звычайна з боку форм арнаменту лепш рэжуцца і заавальваюцца круцей, а з боку фону - больш паката. Пры заавальнай выпуклай лініі дзюбкай разака да сябе трэба імкнуцца, каб дзюбка разака плаўна адбіла крывізну лініі і зняла бесперапынную фаску, пакуль лінія не скончыцца зусім, ці рэзанне пяройдзе ад прыёму на "слаі" к прыёму супраць слою.

Хачу адзначыць наступнае. Пры выкананні разьбы геаметрычнай, рэльефнай, плоскарэльефнай, заваленай і іншых відаў немагчыма паказаць усе прыёмы работы з інструментам. У залежнасці ад вопыту рэзчыка выбіраецца і адкрываецца той ці іншы прыём.

Мал. 13. Заавал з падушачным фонам.



12.2. Заваленая з падушачным фонам

Па тэхніцы выканання і па віду і назначэнню гэта разьба мала адрозніваецца ад заваленай разьбы.

Фота 5. Алень. Матэрыял - сасна. Работа вучня.



У заваленай разьбе фон застаецца плоскім, а бакі форм арнаменту больш крутыя. У заваленай разьбе з падушачным фонам лініі арнаменту глыбейшыя, а фон нідзе не застаецца плоскім, ён усюды выконваецца ў выглядзе падушак.

У вузкіх месцах падушкі ад заавальвання могуць атрымацца нават ніжэй агульнай паверхні арнаменту.

Калі гэтага патрабуе кампазіцыя арнаменту, то падушкі усюды будуць ніжэй агульнай паверхні арнаменту. Парадак і прыёмы гэтай разьбы тыя ж, што і ў заваленай разьбе. Толькі пры заавальванні вялікіх плямаў фону - падушак ці апусканні іх ніжэй агульнай паверхні арнаменту неабходна больш працаваць прамымі стамескамі.

12.3. Зааваленая з падобраным фонам

Гэтая разьба з'яўляецца развіццём зааваленай разьбы з падушачным фонам.

Фон у гэтай разьбе выбіраецца на большую ці меншую глыбіню. Атрымліваецца так, што арнамент як бы ляжыць на роўнай паверхні. Гульня светаценем на плоскарэльефнай разьбе некалькі лепшая, чым на зааваленай разьбе, але таксама невялікая.

1. Надрэзванне. Выконваецца так, як і ў контурнай разьбе. Нахіл стамесак пры падрэзванні павінен быць нязначны, а глыбіня па магчымасці большая.

2. Падбор фону выконваецца пакатымі стамескамі, у шырокіх месцах фону - шырокімі, а дзе вузка і цесна - больш вузкімі.

12.4. Рэльефна-зааваленая разьба

У адрозненні ад папярэдніх відаў разьбы, дзе формы арнаменту выдзяляюцца толькі лініямі ці падборам фону, а самі застаюцца плоскімі, у рэльефна-зааваленай разьбе фон заавальваецца, а формы арнаменту выяўляюцца ў рэльефе.

Тэхніка рэльефна-зааваленай разьбы нескладаная, але распрацоўка форм у арнаменце больш разнастайная. Такой разьбой упрыгожваюцца і дробныя і вялікія вырабы, рамкі, шкатулкі, палічкі, падстаўкі і г. д.

12.5. Рэльефная разьба

Рэльефная разьба - гэта разьба з падобраным фонам на глыбіню не больш 5—7 мм, калі разьба выканана на мэблі і формамі арнаменту, выяўленымі ў аб'ёме ці рэльефе, наколькі гэта дазваляе глыбіня фону.

Падбор фону сам па сабе яшчэ не дае добрай гульні светаценю, што мы бачым на прыкладзе плоскарэльефнай разьбы. Рэльефная разьба цяжка паддаецца апрацоўцы.

Лягчэй за ўсё рэльефная разьба паддаецца матавай апрацоўцы пад воск. Па гэтых прычынах рэльефная разьба, калі глядзець на яе пасля апрацоўкі, атрымліваецца добра толькі на цвёрдых пародах.

Рэльефная разьба прыдае мэблі прыгожы і багаты від у параўнанні з іншымі відамі разьбы.

Фота 6. Бягучы лось. Матэрыял - елка. 1984г. Работа вучня.

Фота 7. Мядзведзь. Матэрыял - сасна. Работа вучня.



Фота 8. Дэкаратыўная птушка. Матэрыял - сасна. 1993г. Работа вучняў.

13. ШТО НАЗЫВАЕЦЦА МАСТАЦКАЙ КАМПАЗІЦЫЯЙ

Пад мастацкай кампазіцыяй разумеюць будову мастацкага вырабу.

Разьбяр-аматар, распрацоўваючы сваю кампазіцыю мастацкага вырабу, выбірае размяшчэнне фігур і дэталей такім чынам, каб увага гледача акцэнтавалася на самым галоўным.

Распрацоўваючы мастацкую кампазіцыю, разьбар-аматар павінен улічыць і дэталі, якія нясуць і дапаможную нагрузку.

Такое ўзаемнае ўзгадненне форм, дэталей і элементаў выявы называецца гармоніяй кампазіцыі.

Мастацкі выраб павінен мець дакладную форму з правільнымі прапорцыямі, якія надаюць вырабу прыгажосць. Вырабы павінны быць зручныя, трывалыя.

Разнастайныя рытмы ў арнаменце з'яўляюцца асновай кампазіцыі і часта сустракаюцца ў вырабах прыкладнога мастацтва.

14. ІНСТРУМЕНТ ДЛЯ ВЫПІЛОЎВАННЯ ПРАРЭЗНАЙ РАЗЬБЫ

Звычайна для выканання праразной разьбы карыстаюцца лучковай пілой.

Яе яшчэ называюць бандарнай, мабыць, таму, што сталяры-бондары выпільвалі такімі піламі круглыя днішчы для бочак. Недасканаласць лучковай пілы ў тым, што замена палатна займае многа часу.

Разьбар-аматар выробляе лобзікі сваёй і вельмі добрай канструкцыі. Яны зручны, з хуткай перастаноўкай і змяняльнасцю палатна.

Лобзікам можна выпільваць пры таўшчыні дошкі на 20 мм.

Для прарэзвання навылётных дзірак і глухіх да 140 мм выкарыстоўваецца самаробны свярдзел "балерына". Але пры рабоце з ім неабходна захоўваць асобныя правілы бяспекі працы.

Для выканання прарэзнай разьбы зручна карыстацца штык-нажоўкай. Яна вузкая, даўжынёй 150—250 мм. Ею зручна выразаць фігурныя, як вонкавыя так і ўнутраныя, паверхні.

15. ТАКАРНЫЯ РАБОТЫ ПА ДРЭВУ

У Расіі развіццё такарнай справы звязана перш за ўсё з іменем знакамітага механіка і вынаходніка Андрэя Канстанцінавіча Нартава, які стварыў арыгінальныя станкі і інструменты. А.К.Нартаў зрабіў такарна-капіравальны медальерны станок, які цяпер знаходзіцца ў Музеі Нацыянальнага сховішча мастацтваў і рамёслаў Францыі.

Гісторыя развіцця такарных станкоў.

Вынаходства такарнага станка складае цэлую эпоху. Этапы яго мадэрнізацыі цесна звязаны з прагрэсам навукі і тэхнікі. Веды іх пашыраць у школьнікаў кругагляд і ўзмацняць цікавасць да тэхнікі.

Многія вырабы з драўніны ўяўляюць сабой цела вярчэння, маюць унутраныя паверхні. Гэта лубкі, вазы, дэкаратыўныя талеркі, сувеніры ў выглядзе бочачак, матрошак, конавак, куфляў і г.д.

Пры стварэнні такіх вырабаў вам спатрэбяцца веды і ўменні. Ствараючы выраб з унутранымі паверхнямі, неабходна ведаць парадак - паслядоўнасць іх стварэння. Пры гэтым тут неабходна захоўваць асобыя правілы бяспекі працы. Паколькі пры расточванні ўнутраных паласцей павялічаны рычаг разца і самы нязначны недакладны рух разца можа прывесці да траўмы рукі.

Маючы пэўны вопыт работы на такарных станках па апрацоўцы драўніны, неабходна праяўляць гібкасць у рашэнні пытанняў.Загатоўкі можна мацаваць на планшайбу або ў спецыяльны патрон. Прымацаваўшы планшайбу да загатоўкі, закручваем у пярэднюю бабку. Устанаўліваем падручнік так, каб перавярнуўшы за гатоўку адзін раз, яна не дакраналася да падручніка. Калі загатоўка ад 120 - 200 мм, то падручнік можна падняць на 20 мм вышэй цэнтра.

Знімаючы паступова стружку з загатоўкі, трэба ўвесь час падсоўваць падручнік да загатоўкі і апускаць яго ніжэй. Калі загатоўка будзе апрацавана па ўсім дыяметры, то можна пачаць расточваць унутраныя поласці.

Спачатку возьмем свярдзел не больш за 30 мм у дыяметры і прасвідруем адтуліну на неабходную нам глыбіню. Затым дастаўшы свярдзел, адсунуўшы ўправа заднюю бабку, ставім падручнік паралельна тарцу загатоўкі, бярэм разец, круглую, можна паукгуглую стамеску. Рухі стамесак робім ад дна кубка да яго краю, і такім чынам растачваем унутраную поласць не толькі цыліндровай формы, але і фасоннай. А потым зноў паварочваем падручнік і пачынаем прыхарошваць знешнюю частку вырабу.

Пры гэтым выкарыстоўваем касую такарную стамеску і лыжачны разец, калі неабходны фасонны малюнак. Пры апрацоўцы загатоўкі касы разец павінен рэзаць пяткай, а ў час падрэзкі тарцоў і ўступаў - дзюбкай.

У час работы з "карэльскай" бярозай неабходна нязначнае паслабленне разца, бо недакладны паварот лыжачнага разца прыводзіць да таго , што разец як быццам захватвае, ламаючы яго, або проста выбіваючы псуе каштоўную драўніну.

Практыкай устаноўлена, што пры выкананні вонкавай апрацоўцы загатовак, калі правая рука трымае ручку разца, то левая рука трымае пярэднюю частку разца і павінна ляжаць на падручніку, прасоўваючы разец узад і ўперад. Расточванне ўнутраных паласцей вельмі працаёмкі працэс. Але яго можна аблегчыць. Бярэм загатоўку з планшайбай і заціскаем у такарны станок па металу. Расточным разцом гэту работу мы выконваем за 10 хвілін, аставіўшы прыпускі на апрацоўку лыжачным разцом на ТДС. Такі прыём найбольш зручны, эканамічны.

Калі выраб гатовы, яго шліфуюць. Спачатку больш буйнай шліфшкуркай, затым - нулёўкай, потым стружкай ад гэтай загатоўкі. У руку набіраем стружкі і прыціскаем да заготоўкі, якая круціцца, пакуль на ёй не з'явіцца бляск. Пасля такой апрацоўкі пакрываем лакам, выпальваем, рэжам арнамент і г.д.

Аздабленне - вельмі важны працэс у вытворчасці вырабаў. Яно мае на увазе дзве мэты: па-першае, выраб пакрываецца лакам, аліфай або воскам, якія ствараюць плёнку, захоўваюць выраб ад атмасферных ападкаў; па-другое, ён набывае закончаны від, выяўляецца тэкстура дрэва. Добрае аздабленне палепшыць выраб, дрэннае - сапсуе яго.

Аздабленне можа быць празрыстым і непразрыстым. Аздабленне мэблі і іншых дробных вырабаў павінна выявіць тэкстуру і павінна быць празрыстым. Непразрыстая апрацоўка: афарбоўка мастацкімі фарбамі, пазалота, серабрэнне, металізацыя - закрываюць колер і тэкстуру драўніны.

Фота 9. Чашка. Матэрыял - карэльская бяроза. Работа аўтара.



Фота 10. Набор кубкаў. Матэрыял - карэльская бяроза. Работа аўтара.

Фота 11. Вазы. Матэрыял - карэльская бяроза. Работа аўтара.

Мал. 14.



Мал. 15.



АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ АПРАЦОЎКІ ДРАЎНІНЫ

1. Падрыхоўка да апрацоўкі (аздабленне)
2. Фарбаванне - марэнне
3. Аздабленне (апрацоўка)

Апрацоўка выконваецца шліфавальнай шкуркай сярэдняй зярністасці, а потым нулёукай. Зачыстку шліфшкуркі неабходна выконваць толькі ўздоўж валокнаў.

Зачыстка цыкляў выконваецца яшчэ ў пачатку разьбы. Цыкля павінна мець правільную форму, гэта значыць роўны рабочы кант. Пры дапамозе шчоткі для змятання з заглыбленняў разьбы вымятаем пыл. Здзьмухваць забараняецца, паколькі пыл можа трапіць у вочы.

Пасля шліфоўкі пакрываем выраб нітралакам, пры выкананні лаку паднімаецца ворс. Калі лак поўнасцю высахне, пашліфуем злёгку нулёукай, знімем ворс і пакрыем масляным лакам.

Марэнне заключаецца ў тым, што драўніне пры дапамозе спецыяльнай арганічнай фарбы надаюць колер, падобны на колер драўніны арэха. Марылку разводзяць у гарачай вадзе ў чыстай шкляной або эмаліраванай пасудзіне.

Жаданы тон вызначаюць нанясеннем растворў марылкі на пробную паверхню. У час марэння нельга наліваць марылку на разьбу, ад гэтага драўніна моцна разбухне і сапсуецца.

Як толькі паверхня праморана, яе праціраюць шчоткай або выпуклай анучкай з мэтай разраўняць марылку і зняць лішак.

ПЛАН РАБОТЫ ГУРТКА “ РАЗЬБА ПА ДРЭВУ“ у школе на год (68 гадзін)

Уводзіны. Правілы бяспекі працы.	- 2 гадзіны
1. Геаметрычная разьба (квадрацікі)	- 2 гадзіны
2 Падрыхтоўка загатовак. Нанясенне малюнкаў. Выкарыстанне інструментаў.	- 2 гадзіны
3. Разьба ліній упоперак валокнаў	- 2 гадзіны
4. Разьба ліній уздоўж валокнаў	- 2 гадзіны
5. Нанясенне малюнка	- 2 гадзіны
6. Завострыванне нажоў, касякоў або стамесак плоскіх. Шліфоўка, даводка разца на скураным рэмені з пастай ГОИ. Выкананне разьбы.	- 6 гадзін
7. Нанясенне малюнка вяртушк, выкананне разьбы (зорачка або падразное ззянне)	- 4 гадзіны
8. Нанясенне рысўнка. Выкананне разьбы.	- 4 гадзіны
Контурная разьба 9. Падрыхтоўка загатовак. Выкарыстаны інструмент і прыстасаванні. Выкананне разной кампазіцыі.	- 4 гадзіны
Рэльефная і плоскарэльефная разьба 10. Нанясенне малюнка. Выкананне разной кампазіцыі.	- 6 гадзін
11. Складанне, састаўленне, укладанне простай кампазіцыі, улічваючы элементы геаметрычнай, контурнай, рэльефнай і плоскарэльефнай разьбы.	- 4 гадзіны
12. Перанос кампазіцыі на падрыхтаваныя шчыты. Выкананне разной кампазіцыі.	- 20 гадзін
13. Апрацоўка разьбы шліфшкуркай, таніраванне і чаканка фона.	- 2 гадзіны
14. Афармленне зробленага пано і яго навеска	- 2 гадзіны

Склаў план работы гуртка настаўнік-метадыст СШ N 67 Рудзянкоў Мікалай Міхайлавіч

ЗАЎВАГА

а) Пададзены мною план работы гуртка " Разьба па дрэву " прапаноўваецца для работы з вучнямі-навічкамі. Вучні, якія займаюцца ў гуртку другі год, выконваюць больш цяжкія работы па сваіх кампазіцыях або па рысунках, прапанаваных настаўнікам.

б) Нажы, касякі вырабляем у школе з шавецкіх нажоў. Заточку робім двухбаковую.

СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Мацвеева Т.А. "Мазаіка і разьба па дрэву"
2. Гаранохіна А.Н. "Гісторыя мастацкай апрацоўкі вырабаў" з драўніны. М., 1987 г.
3. Левін Л.П. "Разьба па дрэву", М., 1957 г.
4. Н.Д.І. мастацкай прамысловасці "Разьба па дрэву". М., 1963 г.
5. Марцінсон А. "Пачынаем майстраваць з драўніны". М., 1979 г.
6. Алег Ларын. "Пакланіся дрэву". М., 1985 г.

ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ 1
1. АБСТАЛЯВАННЕ ПАМЯШКАННЯ 3
2. РЭЖУЧЫ ІНСТРУМЕНТ РЭЗЧЫКА І ЯГО ВІДЫ 5
3. ВЫКАНАННЕ ІНСТРУМЕНТА РЭЗЧЫКА 8
4. ЗАХОЎВАННЕ РЭЖУЧАГА ІНСТРУМЕНТУ 10
5. РАЗМЕТАЧНЫ ІНСТРУМЕНТ 11
6. ІНШЫ ІНСТРУМЕНТ РЭЗЧЫКА 12
7. МАТЭРЫЯЛ. ПРЫРОДА ДРАЎНІНЫ І ЯЕ БУДОВА 13
8. ВІДЫ ПІЛАМАТЭРЫЯЛАЎ І ІХ ВЫБАР 17
9. СУШКА І АПРАЦОЎКА 20
10. ГЕАМЕТРЫЧНАЯ РАЗЬБА 22
11. КОНТУРНАЯ РАЗЬБА 24
12. РАЗЬБА ЛІНІЙ ПАЎКРУГЛЫМІ СТАМЕСКАМІ 25
12.1. Заваленая разьба 25
12.2. Заваленая з падушачным фонам 25
12.3. Заваленая з падабраным фонам 26
12.4. Рэльефна-заваленая 27
12.5. Рэльефная разьба 27
13. ШТО НАЗЫВАЕЦЦА МАСТАЦКАЙ КАМПАЗІЦЫЯЙ 28
14. ІНСТРУМЕНТ ДЛЯ ВЫКАНАННЯ ПРАРАЗНОЙ РАЗЬБЫ 29
15. ТАКАРНЫЯ РАБОТЫ ПА ДРЭВУ 30
16. АСНОЎНЫЯ ЭТАПЫ АЗДАБЛЕННЯ ГАТОВЫХ ВЫРАБАЎ 33
ПЛАН РАБОТЫ ГУРТКА "РАЗЬБА ПА ДРЭВУ" 34
ЗАЎВАГА 36
СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ 37
ЗМЕСТ 38

РУДЭНКОЎ Мікалай Мікалаевіч

Разьба па дрэву.
Рэкамендацыі юным рэзчыкам,
кіраўнікам гурткоў.

Адказны за выпуск Г.І. Касянкоў

Рэцэнзенты В.М. Валякін, Я.М. Сахута
Рэдактар,В.К. Дрозд
Карэктар Л.І. Кароткіх

Здана ў набор 25.09.95г. Падпісана да друку 12.10.95г.
Фармат 60х84 1/16. Бумага газетная. Пячаць афс.
Ул-выд. арк. 2,5 Тыраж 5000 экз. Зак. 64
НПЧ "Фінансы, улік, аудыт" 220004, Мінск, вул. Кальварыйская, 17.
Ліцэнзія ЛВ N 699

Надрукавана на ратапрынце НІА РБ,
220004, г. Мінск, вул. Караля, 16,
пры удзейнічанні ПК ТАА "ПоліБіг".